**А. Зайкіна**

# АСАБЛІВАСЦІ ГЕНДАРНАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЕНЫ БРАВА І МО ЯНЯ

Кампаратыўныя гендарныя даследаванні даюць магчымасць альтэрнатыўнага прачытання твора, чым садзейнічаюць стварэнню цэласнай карціны літаратурнага працэсу (Т. А. Фіцнер). Мэтай даследавання з'яўляецца выяўленне асаблівасцей мастацкага асэнсавання гендарнай праблематыкі, раскрыцця жаночых і мужчынскіх вобразаў у прозе Алены Брава  і Мо Яня.

У выніку праведзенага аналізу вызначаны як тоесныя, так і адрозныя рысы ў раскрыцці жаночых вобразаў. Галоўным гераіням рамана "Жабы" Мо Яня і аповесці "Дараванне" А. Брава ўласціва наладжваць кантакт са знешнім светам, кіруючыся пануючымі сацыяльнымі ўстаноўкамі і стэрэатыпамі. Абедзве гераіні пакутуюць ад пачуцця віны і глыбока адчуваюць адказнасць перад іншымі людзьмі, ахвяруючы такім чынам сабой на карысць дабрабыту іншых. Аднак у выніку і Ларыса Вашкевіч-Крауз ("Дараванне" А. Брава), і Вань Сінь ("Жабы" Мо Яня) знаходзяць сваю аддуху ў жыцці, занятак, які дапамагае ім загаіць душэўныя раны і пэўным чынам збалансаваць сваё існаванне ў свеце. Разам з тым нельга не звярнуць увагу на адрозненні ў мастацкім асэнсаванні жаночых вобразаў. Найбольш прыкметнай з'яўляецца кантраснасць тэмпераментаў, бо Мо Янь надзяліў гераіню ўнутранай сілай і магутнасцю, а Алена Брава адлюстроўвае жанчыну на тым жыццёвым этапе, калі ўсведамленне ўласнай каштоўнасці толькі фарміруецца і пакуль не падмацоўваецца дзеяннямі.

Пры параўнанні мужчынскіх вобразаў варта звярнуць увагу на праблему заблакаванасці эмоцый, якая аб'ядноўвае галоўных герояў апавядання "Змяя, пакрытая пёрамі птушкі сонца" А. Брава і аповесці "Празрыстая чырвоная рэдзька" Мо Яня. Андрэй і Хэйхай не дэманструюць яркіх пачуццяў і эмоцый, што прыводзіць да перажывання глыбокага стрэсу, з-за якога героі звяртаюцца да эскапізму (уцёкаў ад рэальнасці). Эскапізм выражаецца Аленай Брава праз злоўжыванне галоўным героем алкаголем, Мо Янем – праз сыход Хэйхая ў свет мар, праз непрыманне сваёй цялеснасці. Аўтарамі закранаецца праблема безбацькоўства, сацыяльнай неабароненасці і завышаных патрабаванняў да мужчын у сучасным свеце. Абодва аўтары аспрэчваюць навязаныя грамадствам погляды і звяртаюць увагу: мужчына – не адарваны ад рэальнасці індывід, ён таксама мае патрэбу ва ўсебаковым прыняцці і спагадзе.

Творы Алены Брава і Мо Яня ў роўнай ступені закранаюць тэмы гендарнай асіметрыі, адлюстроўваюць шаблоны і стэрэатыпы, з якімі сутыкаюцца не толькі жанчыны, але і мужчыны. Нягледзячы на тое, што літаратура Беларусі і Кітая развівалася асобна адна ад другой, выразна прасочваюцца агульныя тэндэнцыі ў мастацкім асэнсаванні гендарнай праблематыкі.